**Рафал Юзаф Чарвякоўскі (1743, Піншчына – 1816),**
**вучоны-медык, асветнік.**



Рафал Юзаф Чарвякоўскі нарадзіўся 24 кастрычніка 1743 г. пад Пінскам. Дакладнае месца яго нараджэння невядома. Каб атрымаць адукацыю ў клерыкальнай Рэчы Паспалітай, ён уступіў у манаскі ордэн піяраў. Скончыў піярскія школу (1762) і вучылішча (1765). ). У 1771 накіраваны ў Італію вывучаць медыцыну. Потым пры падтрымцы польскага грамадскага дзеяча, рэфарматара вышэйшай адукацыі Хуга Калантая ён сем гадоў правёў у Рыме, дзе 16 сакавіка 1776 г. атрымаў ступень доктара медыцыны.

У 1777 па асабістай просьбе Чарвякоўскага папа рымскі Пій VI вызваліў яго ад духоўнага тытула і звання. Праходзіў медыцынскую практыку ў шпіталях Неапаля, Фларэнцыі, Падуі, Турына, Вены, Парыжа і Берліна. 5(16)10.1779 накіраваны з Пінска ў Кракаў выкладаць медыцыну ў Галоўнай каронпай школе (Ягелонскі універсітэт), з 1780 — прафесар. Заснаваў там кафедру анатоміі, хірургіі і акушэрства. Трэба адзначыць, што такія дысцыпліны не чыталі тут студэнтам з самага заснавання універсітэта — больш чатырох стагоддзяў.

Рафал Юзаф Чарвякоўскі з'яўляецца заснавальнікам першага ў Кракаве анатамічнага тэатра. Паводле ўказа караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага ў 1785 г. ўзнагароджан залатым медалём і зацверджаны прыдворным дарадчыкам па медыцыне.

Пад уплывам Х.Калантая ён пакінуў манаскі ордэн і стаў свецкай асобай. Вучоны апіраўся пры гэтым на прынцып: аказваць медыцынскую дапамогу хворым жанчынам несумяшчальна з духоўным санам. Акрамя таго, ён зрабіў першае ў Кракаве ўскрыццё трупа чалавека. Вучоны праводзіў складаныя для таго часу аперацыі — «сшыванне ран жывата і кішак», трэпанацыі чэрапа, трахеатаміі і іншыя.

У час паўстання 1794 г. быў галоўным урачом лазарэта пры саборы Св. Пятра ў Кракаве.

Памёр ў 1816 г. Празваны "бацькам польскай хірургіі". Аўтар шэрага фундаментальных навуковых прац па медыцыне і хірургіі, у тым ліку кніг: «Агляд хірургічных інструментаў» (т. 1—6, 1816—1817), "Практычная хірургія" (1796), "Падрыхтоўка да хірургічнай дапамогі" (1816) і інш. Вынаходнік шэрага хірургічных інструментаў і аперацыйных метадаў. Падрыхтаваў звыш 200 вучанікоў, сярод якіх – Францішак Касцецкі, прафесар паталогіі і тэрапіі Ягелонскага універсітэта ў Кракаве.

1. Червяковский Рафал Юзеф // Учёные Пинщины / авт.-сост. И.А.Кибак, П.Н.Синкевич, В.В.Василевецкий. Пинск,2012. С.129
2. Чарапіца, В. Чарвякоўскі Рафал Юзаф / Валерый Чарапіца // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск,2003. Т.6. Кн. 2. С.139
3. Саўчанка, М.Л. Чарвякоўскі Рафал Юзаф / М.Л.Саўчанка // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. Мінск,2003. С. 131-132
4. Чарапіца, В.М. Са скарбніцы кніжных паліц / В.М.Чарапіца. Мінск,1994
5. Грицкевич, В.П. С факелом Гиппократа: из истории белорусской медицины [Медики века Просвещения: Рафал Юзеф Червяковский] / В.П.Грицкевич. Минск, 1987. С. 130-131.
6. Очерки истории культуры Пинска XIV-XVIII веков: [Рафал Юзеф Червяковский] // Гістарычная брама. 2009. № 1(24)
7. Орлова, И. Наука без провинции, или Как пинские власти стремятся привлечь земляков к более эффективному социально-экономическому развитию региона: [Рафал Червяковский] /Ирина Орлова // Народная газета. 2006. 5 июля
8. Червяковский Рафал Юзеф // Пинская неделя. 1997. 26 декабря
9. Червяковский (Czerwiakowski) Рафаэль Юзеф (1743—1816) // Rhilatelia.Ru
10. Глубокое:[Рафал Червяковский] // htt://govorim.by/vitebskaya-oblast/glubokoe /stati-o-glubokom/
11. //htt://zhitkovichi.com/_news/main/